# СЛОВА

## СКЛАД СЛОВА

**Успомніце**

Якія часткі слова служаць для ўтварэння новых слоў? Якая частка ўтварае форму слова?

Выкарыстайце схему.




### Аснова слова

**110.** Прачытайце. У якім радку запісаны аднакаранёвыя словы, а ў якім — формы слова?

1. Зімні, зімняга, зімняму, зімнія, зімніх.
2. Зіма, зімаваць, зімні, зімоўка, перазімаваць.

Назавіце корань у аднакаранёвых словах.

Запішыце формы аднаго і таго ж слова. Выдзеліце ў іх канчаткі. Абазначце частку слова без канчатка знакам ⌞___⌟.

Частка слова без канчатка — гэта **аснова слова.**



Правообладатель Акадэмія адукацыі

**111.** Прачытайце.

Сцюжа, завея, снег, мароз, мяцеліца, лёд, снежкі, сумёт, холад, замаразкі, каток, ёлка.

Выпішыце словы, якія маюць нулявы канчатак. Выдзеліце ў іх канчатак і аснову.

Узор. *Снег*□, ...

**112.** Прачытайце тэкст. Чаму зімой дзецям успамінаецца лета? Якую назву можна даць тэксту?




Пасля паходаў у лес мама варыць варэнне. А мы пенкамі ласуемся ды **слоікі** закрываем. Слоік за слоікам хаваецца ў кухоннай шафе лета.

Зімнім вечарам наша сям'я збіраецца за сталом. Мама налівае чай у кубачкі, накладвае поўную талерачку **варэння**. Мы п'ём чай з варэннем і ўспамінаем летнія **паходы**. *(Паводле М. Янчанкі.)*

**сло́ік** — невялікая шкляная або гліняная пасудзіна; *рус.* ба́нка

Выпішыце з тэксту сказы з аднароднымі членамі. Да выдзеленых слоў падбярыце з тэксту іх формы. Абазначце канчатак і аснову ў выдзеленых словах.

**Рм** Раскажыце, якія зімнія нарыхтоўкі робяць у вашай сям'і. Як вы дапамагаеце дарослым у гэтым?

Што яшчэ будзіць успаміны пра лета зімняй парой?

**113.** Прачытайце загадку. З літар, што «схаваліся» на малюнку, складзіце і запішыце слова-адгадку. Выдзеліце ў ім канчатак і аснову.

За акном кру́пы
сыплюцца з н*(е/я)*беснай ступы.
Іх можна пазбіраць,
ды крупніку *(не)*згатаваць.
*У. Карызна.*




**сту́па** — драўляная пасудзіна, у якой таўкуць што-небудзь таўкачом
**кру́пнік** — крупяны́ суп

Спішыце, раскрываючы дужкі.

Знайдзіце ў загадцы аднакаранёвыя словы. Разбярыце іх па саставе.

**114.** З апорай на малюнкі назавіце формы слоў, якія адпавядаюць схемам. Запішыце словы. Выдзеліце ў іх канчатак і аснову.

_____ *а*

_____ *і*



_____ *ая*

_____ *ыя*



Вусна дапоўніце сказы патрэбнымі формамі слоў.

1. Верхавіну ёлкі ўпрыгожвала бліскучая ... . На небе ярка блішчаць ... .

2. ... грудка снегіра нагадвае румяны яблык. Птушкам падабаюцца ... ягады рабіны.



Правообладатель Акадэмія адукацыі

115. Прачытайце верш.



**Першы снег**

Пасыпа*(у/ў)* **мяккі снег**,
і раніцай сама
паклікала мяне
на **вуліцу** зіма.
Перш чым пайсці ў зіму,
я **восень** абдыму
і ліст пашлю **в*(е/я)*сне**:
«Прыходзь, як а*(д/т)*пачнеш!»

*К. Камейша.*

Спішыце, раскрываючы дужкі.
Абазначце аснову і канчатак у выдзеленых словах.

116. Вусна складзіце па падказках алгарытм вызначэння асновы ў слове *добры*.

1. Змяняем … .
*Добры — добрыя, добрага, добраму, добрым.*

2. Знаходзім і выдзяляем у слове ☐.
*Добр*☐*ы*.

3. Частка слова без ☐ — гэта … .
*Добры*.

117. Прачытайце словы. Па якіх прыметах іх можна размеркаваць на дзве групы?

Алеся, раса, Таня, краіна, Галя, школа, Насця, парта.

Запішыце словы ў два слупкі. Выдзеліце ў іх аснову і канчатак. Назавіце зычны гук, на які заканчваецца аснова.

Які канчатак маюць словы, аснова якіх заканчваецца на цвёрды зычны? На мяккі зычны?

**Канчатак у слове залежыць ад таго, на які гук заканчваецца аснова.**

**берэ́т**

**118.** Змяніце спалучэнні слоў па ўзоры.

*Смачн|ы| салодк|і| яблык|□| — смачн|ыя| салодк|ія| яблык|і|*, **прыгожы сіні берэт** — ..., любімае зімняе свята — ..., вясёлая навагодняя песня — ... .

Спішыце. Выдзеліце ў словах аснову і канчатак. Назавіце ў кожным слове апошні гук асновы, ахарактарызуйце яго.

З выдзеленым спалучэннем слоў складзіце і запішыце сказ.

**119.** Прачытайце. Куды спяшаюцца маці з дачушкай?

Калі ласка, дзядзька **вец..р**,
не здзімай ты мой **б..р..цік**.
Лепей хмары разгані,
за **р..кою** адпачні.
**З мамай** мы нясём **абе..** .
Нас чакае хворы **дзе..** .

*Н. Галіноўская.*



Выпішыце выдзеленыя словы. Устаўце прапушчаныя літары.

Абазначце ў запісаных словах канчатак і аснову. Назавіце ў кожным слове апошні гук асновы, ахарактарызуйце яго.



Правообладатель Акадэмія адукацыі

**120.** Прачытайце тэкст. Пра якіх чараўніц гаворыцца ў ім?

## Чатыры сяброўкі

Жывуць на свеце чатыры **чараўніцы**. Яны сябруюць адна з адной, але разам сустракаюцца рэдка.

Першай прыходзіць на зямлю маладая **прыгажуня** ў светла-зялёнай **сукенцы** — Ляля. Яе **валасы** ўпрыгожаны пралескамі. Калі яна ідзе па палях і лясах, расцвітаюць кветкі, а дрэвы пакрываюцца маладымі лісцікамі.

Праз тры месяцы першая **чараўніца** перадае ўладу сваёй **сяброўцы** Цёці. Цёця вельмі прывабная, у цёмна-зялёнай сукенцы. **На галаве** ў яе — карона са спелага калосся. У час панава́ння гэтай чараўніцы паспяваюць ягады, наліваецца жыта, з'яўляюцца плады на дрэвах.

Зноў мінаюць тры месяцы, і Цёця саступае месца трэцяй сяброўцы. Яе завуць Талака́. Апра́нута яна ў залацістае адзенне. **Галаву** чараўніцы ўпрыгожвае вянок са стракатага лісця. З яе прыходам пачынаецца ўборка ўраджаю.



Праз тры месяцы на змену Талацэ́ прыходзіць чацвёртая чараўніца — Ве́я. Яна апранута ў блакітную **сукенку**, усыпаную сняжынкамі. **У валасах** блішчыць ледзяная карона. Вея нясе з сабой сцюжу, мяцеліцу. Яна накрывае **зямлю** белай коўдрай.

З года ў год **сяброўкі** чаргуюцца адна з адной, мяняюць усё **на зямлі**.

Вызначце тып тэксту. Складзіце і запішыце яго план. Назавіце словы, якія дапамагаюць звязаць сказы ў тэксце.

Якія з выдзеленых слоў з'яўляюцца формамі аднаго слова? Размяркуйце іх па групах. Запішыце кожную групу з новага радка. Абазначце ў формах слоў канчатак і аснову. У якіх формах слоў аснова заканчваецца на цвёрды зычны? На зацвярдзелы зычны? На мяккі зычны?

**Рм** Вусна перакажыце тэкст па плане. Выкарыстайце запісаныя формы слоў.

❖ Паслядоўна пералічыце месяцы года. Якія важныя святы мы адзначаем у кожным з іх?

Падумайце, уладаром якой пары года з'яўляецца міфалагічны персанаж Жы́цень? За што яго шанавалі нашы продкі?

**121.** Запішыце словы ў тры слупкі так, каб іх будова адпавядала прапанаваным схемам.

Печ, запечак, печка; рака, рачны, зарэчны; соль, салёны, засолка.


…


…


…

Назавіце ў кожным слове апошні гук асновы, ахарактарызуйце яго. Падкрэсліце адпаведныя літары.



Правообладатель Акадэмія адукацыі

**122.** Прачытайце верш. Якую звычку мае вожык? Чаму ён не хоча гуляць з дзяўчынкай?

### Каця

У Ка..і добры вож..к,
а з ёй гуля..ь не хоча.
У вож..ка сто ножак,
так ноччу ён тупоча.
І Каця вож..ку крычыць,
што хоча но..кі палічы..ь.

*П. Панчанка.*

Спішыце, устаўляючы ў словы патрэбныя літары. Знайдзіце ў вершы формы аднаго і таго ж слова. Выдзеліце ў іх аснову і канчатак.

## ПРАВЕРЦЕ СЯБЕ

### *Адкажыце на пытанні*

1. Што такое аснова слова?
2. Якія часткі слова можна вылучыць у аснове?
3. Ахарактарызуйце апошні гук асновы ў словах *сястра, песня, вясна, хваля, правіла*. Ад чаго залежаць канчаткі ў словах?

### *Творчая хвілінка*

Уявіце, што вы трапілі ў чароўны горад «Склад слова». Яго жыхарамі з'яўляюцца часткі слова. Вы сталі ўдзельнікамі спрэчкі частак слова. Кожная з іх даказвае астатнім, што яна самая галоўная, без яе ў слове або ў мове ніяк не абысціся. Выберыце адну з частак слова (прыстаўку, корань, суфікс, канчатак, аснову) і выступіце ад яе імя. Паспрабуйце даказаць, што выбраная частка слова вельмі важная.